# СТУДЭНСКАЯ ДУМКА

МЕСЯЧНІК БЕЛАРУСКАГА
СТУДЭНСТВА У ВІЛЬНІ.



№ 3 (4). САКАВІК—КРАСАВІК. ГОД II.

1925 г.

ВІЛЬНЯ.
Друкарня Н. Левін і Сын, Нямецкая вул. 22.
1925.

# ЗЬМЕСТ.



---

# СТУДЭНСКАЯ ДУМКА

**Грамадзка - навуковы і літэратурны месячнік Беларускага Студэнства.**

Адрэс рэдакцыі: Вільня, Віленская вул. 12, 6.

Падпіска квартальна з перасылкай . 3 зл.
Цана асобнага нумару . . . . . . 1 зл.

№ 3 (4) | 1925, САКАВІК, КРАСАВІК. | ГОД II.



Пётра Сакол

## Хай гром грыміць.

Хай гром грыміць, хай вые бура,
Хай ломіць горы маланьня,
Хай забушуе ўсё ліхое,
І затрасецца ўся зямля.

Няхай наўкол пануе крыўда,
І мучаць зьдзекі і прымус!...
Хай знаюць варажыя сілы,
Што не загіне Беларусь!

# Доктар Францішак Скарына.

Радзіўся Францішак Скарына ў месьце Полацку ў гадох больш— менш 1485—1490. Быў ён сынам даволі заможнага полацкага мешчаніна-купца—Беларуса.

З моладу Фр. Скарына вельмі ўпадабаў навуку, пачаткі якой атрымаў у доме бацькі, карыстаючыся з агульна-ужыванага ў тыя часы для пачынаючых Псалтыра. Пасьля, узяўшы ад навукі ўсе магчымае ў дома, у 1504 г. паехаў ён у Кракаў і ўступіў на філезоўскі факультэт. Там ён быў пад уплывам выдатнага тагачаснага вучонага Яна Глагоўчыка, які перакладаў Біблію на „рускую“, г. зн. беларускую мову. Ен жа—Глагоўчык, відаць, і закінуў Скарыне зярнё думкі аб перакладзе Бібліі на зразумелую народную мову.

У Кракаве прайшоў Скарына т. з. „сем свабодных навук“, і ў 1506 годзе скончыў філёзоўскі факультэт з вучонаю ступеньню бакалар філёзофіі.

Цікавячыся яшчэ мэдыцынаю, факультэту якой у Кракаве ня было, паехаў Скарына заграніцу, каб там здабыць мэдычную веду. Вучыўся ён у Празе Чэскай і ў Нямеччыне пры варунках матэрыяльных далёка ня спрыяючых. Аднак жа, раз намечанага ён дабіваўся і дабіўся.



Доктар Францішак Скарына.

Ужо ў 1512 г. прыехаў ён у Бадую, каб экзаменавацца на доктара мэдыцыны.

Ацаніўшы здольнасьці і веду Скарыны, прафэсары згадзіліся экзаменаваць яго нават дарма, аб чым прасіў іх Скарына, бо матэр'яльна, дзякуючы смерці бацькі, чуўся ён блага.

Экзамен ён здаў нязвычайна добра і з вучонаю ступеньню доктара вярнуўся, відаць, пехотай да Полацка.

Здабываючы веду, бадзяючыся ў трудных варунках заграніцаю, Скарына дбаў не аб сабе, не асабістымі мэтамі ён кіраваўся, — але імкнуўся да таго, каб здабыўшы веду, магчы служыць свайму беларускаму народу.

Вось чаму, будучы яшчэ заграніцаю, ён блізка знаёміцца з дру-

карскаю штукаю, а вярнуўшыся на Бацькаўшчыну перанікаецца думкаю пералажыць на беларускую мову Біблію і надрукаваць яе. У 1516—17 гг. Скарына, здабыўшы патрэбныя рукапісы, пры грашавым падтрыманьні віленскіх мяшчан: Б. Онькова і Я. Бабіча, паехаў у Прагу Чэск. і залажыў там пры помачы найлепшых нямецкіх майстроў уласную друкарню.

У працягу двох гадоў у Празе выдаў Скарына 22 кніжкі пабеларуску.

Кіруючыся галоўнай думкай, залажыць друкарню на Бацькаўшчыне, Скарына перавозіць усе друкарскія прылады і кніжкі ў Вільню і тут у доме бурмістра Я. Бабіча закладае першую беларускую і, нагул, першую на славянскім Усходзе друкарню. Што праўда, толькі дзьве кніжкі ў 1525 г. надрукаваў Скарына ў Вільні: „Апостала“ і „Малую Падарожную Кніжыцу“ (відаць ліхія варункі перарвалі яго працу), але ўсё такі ён зрабіў свае, дапяў свае галоўнае мэты; ён зрабіў тое, чым, запраўды, сягоньня мы можам гардзіцца.

Гэтым ён палажыў фундамантальны камень пад дом беларускае культуры.

З працы і ідэі Скарыны карысталіся ня толькі Беларусы, але і Маскоўцы і Украінцы, друкарства якіх разьвілося значна пазьней.

Правёўшы ўсё сваё жыцьцё ў ахвярным служэньні свайму народу, Скарына скончыў жыцьцё сваё ў вялікім недастатку.

Калі і дзе Скарына памёр ня ведама.

---

Сёлета 25 сакавіка Беларусы ў Вільні сьвяткавалі 400-я ўгодкі закладзінаў беларускае друкарні і надрукаваньня першае беларускае кніжкі ў Вільні Фр. Скарынаю. Сьвяткавала гэныя ўгодкі і ўсё сьвядомае беларускае грамадзянства, аб чым сьведчаць тыя тэлеграмы, якія атрымала Бел. Нав. Т-ва ў дзень сьвята з правінцыі і з заграніцы.

Аля ў гэны дзень мы ня толькі павінны аддаць чэсьць Вялікаму Сыну Беларусі, ня толькі ўшанаваць памяць аб ім, ня толькі падчыркнуць значэньне яго працы, — але гэны вялікі дзень мусіць быць тым імпульсам, які папхнуў бы нас пранікнуцца тымі ідэямі, ахвярнасьцю і энэргіяй, з якімі нёс Скарына сьвятло і дабро свайму народу.

Як Скарына, пранікнуты любасьцяй да свайго беларускага народу, з надзвычайнай энэргіяй і ахвярнасьцю, нёс яму асьвету ў роднай мове і, маючы веру і надзею ў даканальнасьць свае мэты — дасягнуў яе, — так і мы мусімо пранікнуцца тым жа і з няменшай энэргіяй і ахвярнасьцю прадаўжыць распачатае ім дзела ў служэньні свайму народу.

І з гэтаю энэргіяй і вераю мы, як і Скарына, дасягнем свае аканчальнае мэты, свайго Нацыянальнага Ідэалу!

---

# Аб аргумантах ад розуму і аб аргумантах ад сэрца.

(З цыклю „Штодзенныя думкі“).

(Гл. № 1 (2) „Студ. Дум.“).

II.

Пэрыяд адраджэньня Беларусі, сучасьнікамі якога мы зьяўляемся, ёсьць пэрыяд пераважна, а мо' і выключна літэратурна-поэтычны. Мы не абмылімся, калі скажам, што да сёньняшняга дня беларускі адраджэнскі рух вядзе і пасувае наперад беларускі пісьменьнік, ці бліжэй — беларускі паэт. Беларускае аповесьці і рамана, як наагул, сур'ёзнай прозы, яшчэ няма. Яшчэ не дасьпеў яе час. Тым больш не дасьпеў час і для беларускай навукі,—яна ёсьць справа заўтрашняга дня. Мы жывем, калі можна так характарызаваць, у эпоху свайго „нацыянальнага романтызму“, а романтызм, як ведама, заўсёды „пяяў і будзе пяяць у вершах“. Элемэнт глыбокага цікаваньня жыцьця, крытычнага думаньня над яго праблемамі, што даецца ў выніку прозаічнага твору, — усё гэта яшчэ наперадзі. Пакуль што мы маем верш, — пераважна лірычны, што таксама характарызуе романтычны ўклон творчасьці. Але тое, што мы маем у гэтай галіне нагэтулькі багата, дасканала, сьвежа і арыгінальна, што мы можам быць зусім спакойнымі за сваю будучыну.

Беларусь нашых дзён прысутна пры разсьвітаньні свайго творчага духа. Да зэніту яшчэ далёка, — але гэтае разсьвітаньне нагэтулькі багата зьместам і барвамі, што поўдзень нашага рэнэсансу абяцае быць пагодным і слаўным.

Наша паэзыя — добра завостраны меч, — духовы меч, што крышыць мур сьцюдзёнасьці і недавера. Паэт нясе гэты меч — ён б'ець ім у сэрца людзей, мінаючы розум, разсявае сум і цемру сучаснай гадзіны. Для ўсіх недаверкаў, для ўсіх „слабых духам“, гэты меч — песьня—ёсьць адзінае збавеньне:

„Бійце ў сэрца іх, бійце мечамі,

„Не давайце чужынцамі быць“... — гэты заклік узмацуе не адну хістаючуюся душу і вывядзе на адпаведны шлях не адзін заплутаны розум.

І, запраўды, шмат хто з інтэлігэнтных працаўнікоў быў скіраваны на нацыянальны шлях, ласьне, гэтым мячом,—песьняй і вершам, налітымі сьлязьмі і кроўю. У украінскім адраджэньні да ліку іх належыць гэткі выдатны чалавек, як Міхайло Драгаманов. Гэта ён прызнаваўся, што „вывучэньне украінскіх песняў прымусіла яго моцна палюбіць гэты народ“. Ласьне, народная песьня і гэній Шаўчэнкі зрабіў з яго заядлага расейскага космополіта, — адным з галоўных

будаўнічых украінскае справы. Вядома таксама, што нават і зрусыфікаваны Гоголь, нават і той пісаў сваім сябром у Кіеў: „пришлите мнѣ пѣсен украинских: я задыхаюсь в здѣшней петербургской атмосферѣ“.

Скептычна настроены інтэлігэнт можа заўважыць, што сучасная беларуская паэзыя ня мае вялікай вартасьці, дзеля таго, што яна надзвычайна аднаадменна: пераважаючую частку яе становяць сумныя песьні аб горы, нядолі, нудзе і бядоце. Такі характар, быццам, не абяцае Беларусі нічога добрага. Доля бадзяньня пад чужой прынукай, доля беднасьці, забітасьці, небарачаства, аб чым поўна ў нашай літэратуры, сьведчыць аб заняпадзе народнае энэргіі, аб пэўнай волявой дэгэнэрацыі. І скептыкам, ды пэссымістам здаецца, што калі ў беларусаў няма іншай духовай стравы, дык гэтую атруту трэба кінуць. Каб уратавацца ад духовай сьмерці трэба ўхапіцца за больш бадзёрную, больш актыўную і надзейную літэратуру, хоць бы яна была чужая. Па іх перакананьню характар беларускай поэзыі сьведчыць, што, быццам, народ беларускі, як арыгінальна-творчая нацыя, — няжыцьцёвы, а непакояцца тым, што няжыцьцёва ня мае сэнсу. „Падаючага штурхні“, казаў Ніцшэ, усё роўна з штучнага выхаваньня нічога здаровага і годнаго будучыны ня выйдзе. Нашыя правінцыяльныя ніцшэанцы вельмі спагадаюць гэткім мысьлям.

Мы павінны згадзіцца, што цяперашняя (ня сёньняшняя!) беларуская паэзыя маець пэўныя аднабокасьці. Яна сама ў гэтым шчыра прызнаецца. Развярніце найбольш салідны збор твораў першага паэта Беларусі—Янкі Купалы: на першай старонцы вы знойдзеце эпічна-спакойную заяву, што ў ім „больш за ўсё нуды праклятай“. Так яно і ёсьць і з гэтым нельга спрачацца. Паэзыя—люсгэрка жыцьця і калі жыцьцё ненармальнае і горкае, дык і паэзыя будзе горкай і нуднай. Але рабіць адсюль пэсымістычны вывад — зусім дарма.

Мы добра ведаем, што некаторыя асаблівасьці нашага нацыянальнага „Я“, якімі мы хацелі-б гардзіцца, шмат хто з чужынцаў лічыць за вялікія хібы. Так, прыкладам, нашую прыраджоную скромнасьць — лічуць за забітасьць, за хваравлівую, арганічную нyздольнасьць; адсутнасьць у нас захапнасьці, якая ў гісторыі ўзгадоўваецца колёнізацыйнымі імкненьнямі, — прыймаюць за адзнаку слабасьці; нашую прыроджаную мягкасьць і лагоднасьць, што сьведчыць аб гістарычнай культурнасьці беларускага народу, — прыймаюць за адсутнасьць цьвёрдасьці, трываласьці і ўпартасьці ў барацьбе. Мы добра ведаем гэтыя агідныя, абрыдлыя прыпеўкі аб „забитых бѣлоруссах“, аб „biednych kmiotkach“. І трэба згадзіцца, што да гэтых прыпевак мы самі — сьвядома, ці несьвядома *) дакладалі руку.

Але, паўтараем, ад гэтых прызнаньняў таксама далёка да пэсымізаў у думках аб будучыне Беларусі, як неба далёка ад зямлі.

---

*) Да сьвядомага паменьшэньня свайго значэньня мы залічаем вельмі няўдалы спосаб беларускіх літэратарау выбіраць сабе псэўданімы. Рэдка які з гэтых псэўданімау (іх наагул залішне многа!) сьведчыць аб упэуненасьці аўторах у сваіх сілах.

З рэдкай правяднасьцю зразумеў гэта знамяніты „гарун“ Беларусі — Аляксандар Прушынскі. У сваім дынамічным вершу „Паэту“ ён загадвае:

„Прашу цябе, мой брат, сьпявай аб нашым горы,
„Аб тым, што ёсьць цяпер і што даўней было,
„І што ў мільёнах душ разоры правяло.
„Прашу цябе, сьпявай аб горы песьнь адну, ты,
„І наш гаротны лёс рабі яшчэ цяжэй. —
„*Тады, убачыш сам, — парвуцца духа путы*
„*І будзе ясны дзень да нас тагды бліжэй*“... (курс. мой, Г.).

Так, ласьне, і ёсьць: песьня аб горы пяецца паэтам не для таго, каб народ нікнуў і занепадаў яшчэ больш, а для таго, каб ён выгартоўваў у сабе новую сілу, далейшую здольнасьць пераняясьці цяжары сучаснасьці. Гаротная песьня — гэта той молат, які „дробіць шкло— куець булат“.

Рука паэта часта сьвядома нацягвае стралу народных цярпеньняў: чым больш напружаннасьць — тым далей паляціць страла вызваленьня.

І дарма імкнуліся бы нас штурхаць нашыя вучоныя схолястыкі, нашыя інтэлігэнтныя мяшчане: заштурханыя ў вяках мы абіліся і на штурчкі ўжо не рэагуем. Ня падаць гатовы мы, — а ўстаць. Устаць ува весь гіганскі ўзрост буйнага дванадцацёх мільённага ўваскрошага народу. Устаць са сьветлым чалом, на якім яшчэ зіяюць раны ад стагодняга цярновага вянца, са словам божай праўды на вуснах, закутых у вяках пячаткай маўчаньня.

Слова свабоды нашай ужо грыміць, — і сьмешнымі здаюцца нам палахлівыя, хаваючыся, шчырачыя зубы прарочаства. Яны загінуць як цені ночы.

Паэт наш вядзе нас да сонца! Дарогу беларускаму паэту!

**Ал. Галынец.**

# Баляда „Сьвіцезь“ А. Міцкевіча.

Наваградчына з сваімі ўзгоркамі, лясамі, перарэзанымі мноствам рэк і рэчак, чароўнымі вазёрамі належыць да найхарашэйшых краёў Беларусі. А Міцкевіч, жывучы ў Завосьсі, пазьней у Наваградку, скуль часта езьдзіў у госьці да сваіх у павеце, знаў родную прыроду і любіў яе. Улюбіў яе яшчэ балей, як ад ае ад'ехаў, жывучы, як студэнт унівэрсытэту ў Вільні або як вучыцель гімназіі ў Коўні.

Магчыма, што паэт знаў рана і возера Сьвіцезь, але пазнаў яго бліжэй у 1818 г., калі з сваім прыяцелем Тамашам Занам прыехаў першы раз у Тугановічы да Верашчакі, у двары якога было гэтае возера.

Хараство возера зрабіла вялікае ўражаньне на А. Міцкевіча, асабліва ночны яго выгляд. Велічыня возера, густы, высокі лес, яго абступаючы, ночная цішыня рабілі ўражаньне чагось вялікага, няведамага, таемнага, а месяц і зоркі, узьнёсшыся высока ў небе і адбіваючыся ў водах Сьвіцезі, тварылі вялізарны пазор *) і рэлігійную чароўнасьць. Усё гэта, як найбалей, гадзіліся, каб Міцкевіч выбраў форму баляды дзеля выліцьця сваіх уражаньняў.

Знацьцё ня толькі беларускае (ці ляпей крывіцкае) мовы, словамі каторай паэт часта карыстаўся ў сваіх творах але й крывіцкае народнае паэзіі—песьняў, легендаў, байкаў ці то безпасярэдня ці пасярэдніцтвам суседа і прыяцеля Яна Чачота, што зьбіраў крывіцкія народныя песьні і выдаваў іх, як „Piosenki wieśniacze z nad Niemna i Dzwiny w narzeczu ludu krywickiego“, пісаў сам крывіцкія (беларускія) вершы і быў найвялікшым народнікам з усяе філёмацкае групы, дала яму магчымасьць лёгка знайсьці аснову дзеля задуманае баляды. Пэўна не ад аднаго толькі рыбака, аб якім апавядаў Ходзька ў 1846 г., чуў ён казку аб німфах (русалках) Сьвіцескіх. Аб Сьвіцезі і ўсім іншым чуў ён ад многіх і мо' балей мноства матар'ялу, чымся нястача яго, перашкаджала паэту даволі яго выкарыстаць у сваёй паэтычнай творчасьці. З казак аб дамавінах, лясунох, русалках ён узяў адну аб німфах-русалках Сьвіцезі. З легендаў аб запалых замках, цэрквах, касьцёлах і мястох, узьнялася думка аб запалай Сьвіцезі. З міталёгічных казак аб перамене людзей у зьвяраты і краскі паўстала думка аб перамене жонак сьвіцескіх у ўзьбярэжныя краскі і зельле. Лучачы казкі аб сьвіцязянках з легендамі аб западаньні местаў, паэт мусіў у сваёй фантазіі знайсьці прычыну дзеля гэтага няшчасьця. Назоў красак цары падсунуў яму маскоўскі наезд, хоць за Міндоўга маскоўцы на Беларусь не нападалі, а калі з часам пачалі нападаць, дык да стагодзьдзя XVII да Наваградка не даходзілі.

Драбніцу аб жаданьні жанок сьвіцескіх самых сябе пазабіваць Міцкевіч узяў і прытарнаваў з гістарычнае традыцыі. Ён у зацемках да Гражыны кажа: „Ад п. Анацэвіча, які ведае нацыянальную гісторыю, я чуў, што ў рукапісе валынскага летапісца ёсьць зацемка аб слаўным паступку жанок нейкага літоўскага места, каторыя, як мужы адыйшлі на вайну, самі баранілі замак, і ня могучы адбіцца ад непрыяцеля, валей самахоць узялі сьмерць, чымся няволю“. Каб давесьці, што ў нашай Бацькаўшчыне-Беларусі жонкі ў грозную часіну ваявалі, або, што, прынамся, нашыя суседзі аб нас гэтак думалі, цікаўна яшчэ прывесьці ніжэйшы прыклад. У „быліне“ „Дабрыня сват“ дачка літоўскага караля ходаецца, як рыцар, з дужасілам Дунаем Іванавічам і ляпей за яго страляе з лука. Быліна гэтая, як даведзена, мае за аснову гістарычнае здарэньне—пабеду кн. Валадзімера Кіеўскага над князем Полацкім Рогваладам і забраньне сілком сабе за жонку дачку Рогваладаву, Рагнеду. Ліцьвіны быліны такія-ж, як і ліцьвіны Міцкевіча, г. зн. Беларусы.

Міцкевіч хацеў узьвялічыць ня толькі абраз роднага краю, але

---

*) *Пазор*—вонкавае хараство.

й сям'ю Верашчакаў, ці інакш Марылю Верашчачышку, каторую пакахаў. Дзеля гэтага ў балядзе, пасьвячанай Міхалу Верашчаку, імя князя Сьвіцезі, Тугана творыць ад назову двара Верашчакаў Тугановічы, і робіць яго іхнім продкам.

У зьмесьце баляды трэба адрозьніць рамкі ад запраўднае падзеі. У рамках знаёміць нас паэт з возерам, дзе яно ляжыць, як выглядае, асабліва ўначы, якія там бываюць страхоцьці. Далей, каб адкрыць тайнасьць, Верашчака загадаў закінуць у возера невад „глыбокі ў стоп дзьвесьце". Невад выцягнуў жанчыну-сьвіцязанку, каторай апаваданьне ёсьць запраўднай балядаю. На месцы возера стаяла калісь места Сьвіцезь. У часе нападу Масквы князь Міндоўг з Наваградка загадаў князю Сьвіцезі, Тугану прыйсьці яму на помач. Калі Туган ужо крануўся, ён схамянаецца, што можа „сваіх людзей дзеля чужое згубіць абароны". Варочаецца ў замак, але дачка яго супакоіла, дык паехаў. Тымчасам запраўды няпрыяцель уначы аблёг места. Перапалоханыя жонкі, каб усьцерагчыся ганьбы, хочуць скончыць жыцьцё самагубствам. Гэтаму аднак праціўіцца княжна ня дзеля страху сьмерці, але дзеля таго, што спадзяецца помачы Божае. І помач гэная прыйшла.

У асобе княжны Сьвіцезі паэт даў ідэал мужняе і ахвярнае жанчыны, каторы ён прадстаўляў таксама ў „Жывіле", „Гражыне" і „Альдоне".

А ідэал гэты паэт хоча бачыць і ў Марылі. Марыля—свая сьвіцязянкі, дачкі Тугана, дык значыцца й яна прыбрана цнотамі княжны Сьвіцезі.

**Я. С.**

**В. Грывіч.**

# Мясьцівыя нябошчыкі.

(Усе правы аўтор пакідае за сабой).

(Гл. № 1 (2) „Студ. Дум.").

II.

Шпаркім шагам йшоў Якуб праз гумно, кіруючыся на цянькі к могілкам, да якіх было з добрую вярсту. У гумне за будынкам было ціха і спакойна. Але хмаркі, якія шпарка беглі праз месяц, давалі знаць, што дзьме даволі моцны заходні вецяр. Часамі ён, прарываючыся праз праслы каля будынку і шчылінкі ў асьверах нейк жаласна, быццам, плачучы енчыў.

Хутка Якуб быў ужо ў канцы гумна і пералезшы праз плот апынуўся ў полі. Тут на прасторы вецяр падзьмуў ужо мацней; кусты і дрэвы зашумелі і затрасьліся. Якубу зрабілася жудасна. Ён затрымаўся і аглянуўся назад. Кругом было ўсё пуста і глуха. З вёскі данасілася вясёлая музыка, перамешаная з брэхам сабак. Направа за

рэчкай у суседняй вёсцы сям-там мігацелі яшчэ ў хатах аганькі. І ніводнай душы кругом, толькі хмаркі, якія беглі па небу, беглі што раз то ўсё гусьцей і гусьцей зьліваючыся на захадзе ў адну вялікую хмару; хмара шпарка падымалася ўсё вышэй і вышэй, грозячы памінутна закрыць усё неба.

Страх пачаў агортываць Якуба, але ён яшчэ не паддаваўся. Розум яму гаварыў, што баяцца няма чаго, а, узгадаванае на байках, легэндах аб страхах, як на чымсьці бязумоўна ад літары і да літары праўдзівым, сэрца пачынала дрыжэць. Распаляная гарэлкай галава хлапца лёгка перамагла, аднак, гэты страх і ён ўзноў пайшоў уперад. Скора ён перайшоў канаву, якую перацінала сьцежка і пачаў збліжацца да самых могілак, якія разлажыліся на заросшым высокімі соснамі падгорку. Глыбокі роў ды, зробляны з каменьня і моху, высокі і шырокі вал акружылі іх з усіх бакоў і толькі вузенькая брамка ад дарогі пакідала прыступны праход на гэтае мёсца вечнага супакою.

За гэтай абгародкай старыя сосны пад націскам ветру неяк грозна шумелі і стагналі. Высокія і нізкія крыжы, рознай формы і веку і з рознага матэр'ялу зробляныя, якія то паасобку то па некалькі разам разсеяліся пад гэтымі соснамі, у слабым сьвятле, пачынаўшаго хавацца за хмару месяца, выглядалі якімісь таемнымі і непадкупнымі старажамі тых, хто пад імі быў пахаваны.

Дзяцюк акінуў вокам гэты вобраз кругом і яму стала страшна гэтых маестатычна-вялічавых крыжоў. Сэрца пачало неяк моцна біцца, валасы натапурыліся пад шапкай. Прад вачыма яго пачалі прасоўвацца абразы з тых нязлічаных казак і легэндаў аб тым, як жорстка і неміласэрдна былі пакараны за сваю непашану і адвагу ўсе тыя сьмялягі, што адважыліся ноччу схадзіць на могілкі, ня толькі штось там узяць. Таемны неякі голас пачаў яму шаптаць:

„Ня йдзі... вярніся"...

Ён ужо хацеў павярнуцца назад, як раптам прад вачыма яго, як жывы, стаў высокі з сівою барадой Язэп. Якуб відзіць яго як жывога, ён стаіць, гладзіць сваю доўгую бараду і, злосна з пагардай сьмяючыся, кажа:

„Ня сходзіш"...

Як іголкамі гэта кальнула дзяцюка і ён не застанаўляючыся ўжо над тым, што з ім можа стацца на могілках, рвануўся ўперад. Хутка прайшоўшы брамку, ён апынуўся на могілках. Тут усё было пуста і нёма; нават старыя сосны, як-бы перапужаныя ягонай у такую пару сьмеласьцю, на момант прыціхлі, быццам, чакаючы чагосьці важнага —грознага.

Якуб аглянуўся кругом, шукаючы цяпер ужо чаго-небудзь такога, чым-бы мог усім сьцьвердзіць, што ён сапраўды быў на могілках. Аднак, кругом, апрача крыжоў, нічагусянькі такога падобнага ня было.

— „Узяць вун гэны новенькі крыж", зьявілася раптам яму ў галаве думка.

Ня доўга думаючы пераскочыў ён праз тыя магілкі, якія адгараджывалі яго ад аблюбаванага крыжа і, абхапіўшы рукамі, моцна пацягнуў яго ўгару. Крыж усёроўна, як-бы чакаючы гэтага, нават ня ўпіраўся. Узваліўшы яго сабе на плячо, Якуб павярнуўся к варотам, каб ісьці дамоў. У гэты момант заходні вецяр з страшнай сілай падзьмуў на дрэвы; дрэвы неяк сумна застагналі й заенчалі. Прачхнуўшыся ад даўгага сну сава, усёроўна як-бы хочучы сказаць „Ня руш“!., дзесьці праразьліва і голасна закрычала.

Думаўінным холадам абдула гэта ўсё нашага дзяцюка і ён, сам нават ня знаючы, чаго гэта ён так перапужаўся, з усяго духу папёрся да вёскі, моцна трымаючы сваю здабычу.

III.

Якуб выйшаў з хаты Ляваня, каб ісьці на могілкі, з ім выйшла і ўся вясёласьць. Маладуха ламала рукі і плакала, голасна прымаўляючы па сваім даражэнькім брацiку. Старэйшыя выгаварывалі Язэпу, навошта ён пайшоў з Якубам у заклад, іншыя яго баранілі. Дзяўчаты кінуліся супакаіваць маладуху, але гэта ім ніяк не ўдавалася.

— „А мой-жа ты арацейка, а мой-жа ты родненькі!.. А завошта-ж ты сябе губіш!“... галасіла яна на ўсю хату.

Маланкай вестка аб закладзе пераляцела і ў клець і музыка адразу і там сьціхла. Усе з напружаньнем і цікавасьцю пачалі чакаць той часіны, калі вернецца Якуб з могілак. Паволі і нудна паўзьлі мінуты чаканьня; аб сьмеху ніхто і ня думаў, каб гэтым не паразіць старэйшых. Палахлівейшыя пачалі, то незаўважна, каб з іх не сьмяяліся, а то і ў адкрытую, ціснуцца далей ад дзьвярэй, баючыся што абражаныя сьмеласьцю Якуба нябошчыкі памсьцяцца і на іх. Былі і такія, якія хвалілі Якуба і цьвердзілі, што з ім на могілках нічагусянькі благога ня здарыцца, што і яны ўзяліся-б схадзіць і штось прынясьці з магілак. Аднак, страх, які панаваў над большасьцю прысутных, перадаваўся і ім, і ў іхныя душы паволі закрадалася няпэўнасьць.

А тут яшчэ гэтыя казкі і легэнды аб страхах, якія бываюць на могілках, вылязьлі з палахлівых душ і плывуць плывуць па хаце і клеці. А тыя, хто іх цяпер бае, з шчырасьцю ўпэўніваюць сваіх слухачоў, што гэта шчырая праўда, што гэта здарылася там і там, што пры гэтым здарэньні быў яго бацька, дзядзька, а часамі і ён сам.

І страх чорнымі крыламі сваімі абхоплівае ўсіх, закрадаецца нават у самыя адважныя і сьмелыя душы. А на дварэ робіцца ўсё цямней і цямней. Цёмная хмара даўно ўжо закрыла месяц. Вецяр дзьме што раз то ўсё мацней і мацней. Дрэвы жаласна енчаць і стогнуць, асьверы пяюць і скавычуць, як-бы чуючы штосьці нядобрае. Ужо першыя каплі халоднага, ліпкага вясеньняга дажджу зваліліся на зямлю, забарабанілі па стрэхах і вокнах сваей, быццам, мярцьвечай кашчавай рукой. Дзесьці далёка ў лесе за балотам зацягнуў сваю жудасную песьню воўк; яе падхапілі хатнія сабакі.

У гэты момант адчыніліся дзьверы ў хаце Ляваня і на парозе зьявіўся Якуб. Высокі як дуб, у сівым амаль-што белым доўгім армяку на плячох, з доўгімі раскудлачанымі ветрам валасамі, якіх не прыкрывала цяпер ужо шапка, ён як зданьне якоесь стаяў у дзьвярох, трымаючы перад сабою белы новенькі крыж.

Усе ўскрыкнулі і анямелі ад страху.

— „Вон!.. вон адгэтуль!“.. Крычалі ўсе немаголасам, як мага далей уцякаючы ад дзьвярэй.

Але куды было ўцякаць?—хата паўнюсенька людзей, покуць застаўлены сталамі.

І ўсе, як стада спалоханых авец, кінуліся куды мага хавацца. Душучы і топчучы адзін аднаго, людзі, бяз розьніцы веку і стану, лезьлі на сталы, хаваліся пад лавы. Пад іх дружным націскам пачало ўсё трашчаць і ламацца, разьбіліся і згасьлі лямпы і ў хаце стала цёмна. Падняўся праразьлівы крык, лемант і енк душаных і калечаных людзей.

І калі гэта ўсе трохі супакоілася і хтосьці з сьмялейшых дзяцюкоў запаліў сярнічку, каб асьвяціцца, Якуба ўжо ў хаце ня было: ён зьнік як зданьне якоесь, за каторае яго палічылі, калі ён з крыжам сваім зьявіўся ў хаце.

## IV.

Якуб, убачыўшы той перапалох, які ён зрабіў зьяўляючыся ў хату з вырваным з сьвежай магілкі крыжам, адразу працьверазеў і ад таго запалу, з якім ён браўся ў заклад, і ад гарэлкі, якая перш яму гэтага запалу дадала. Аднак, цяпер было ўжо позна варочацца назад: заклад ужо стаўся, ён яго выйграў, выйграў так скора, хоць можа і дарага гэта будзе многа каму каштаваць. Але што рабіць цяпер з гэтым крыжам, які ён не падумаўшы перш, сюды прынёс? Кінуць дзесь пад страху не выпадала, каб не абразіць сваякоў таго, з чыей магілкі ён яго прынёс, а то і, крый Божа, не папасьці пад суд. Нясьці назад ў гэткую цямніну, якая панавала на дварэ цяпер, было неяк прыкра і боязна: страх тлуму перадаваўся і яму, ледзяніў душу, бегаў мурашкамі па скуры, натапурываў валасы.

Аднак, будзь, што будзь, а крыж ён мусіць занясьці туды, адкуль яго ўзяў. І Якуб, перахрысьціўшыся, узноў, як і перш, праз гумно пайшоў сьцежкай на могілкі.

Дарога гэта цяпер была ўжо зусім прыкрая. Халодны вецяр з сілай нязнанай веяў на полі і, зрываючы жоўтыя лісты з кустоў і дрэваў, дзіка выў і енчаў, абдаючы з усіх бакоў халоднымі ліпкімі кап лямі. Часамі ён неміласэрдна закручываўся каля самых ног, рагатаў шалёным рэхам у галінах дрэў, у стрэхах будынку, у шчылінах варот і пляваў аж у самыя вочы. Кругом было цёмна, хоць калі вочы; нават, аганькоў, якія перш гарэлі ў недалёкай вёсцы, цяпер ужо ня было відаць.

Паволі і асцярожна, каб ня зьбіцца з сьцежкі, хоць і дрыжучы

ўсім целам ад холаду, а можа, і страху, Якуб ішоў уперад. Хутка ён апынуўся ля могілак і, перайшоўшы брамку, па вузкай сьцежцы дайшоў да тэй магілкі, на якой вырваў крыж, сагнуўся і стаў мацаць рукой дзіркі, у якой перш сядзеў крыж. Аднак, дзіркі ён не находзіў: то яму пад руку пападаўся камянь які, то кусок дзерава, то разьбіты чарапок.

На, ня зусім вольную ад забабонаў, душу Якуба гэта веяла халодным жахам і да яго зачалі ціснуцца розныя страхі. Але крыж усёткі трэба паставіць. І ён з новай энэргіяй, хоць і трасучыся ўжо як асінавы ліст, пачаў мацаць па зямлі рукою. На гэты раз ён быў шчасьлівейшы; дзірка знайшлася. Яна была ў яго каля самых ног.

Ня доўга думаючы ён паставіў у яе крыж і, узяўшы яго за плечы, пачаў уціскаць у зямлю. Крыж паволі і неахвотна, быццам, у штосьці ўпіраючыся, ці за штосьці чапаючыся, улазіў усё глыбей і глыбей, аж на астатку, як здалося Якубу, сеў на свае мейсца.

Цяпер ужо нічога даўжэй не затрымвала Якуба на могілках і ён павярнуўся і ступіў уперад, каб ісьці дамоў. Дарма толькі было яго стараньне: штосьці, як чыясь нявідзімая дужая рука, трымала яго моцна за палу сярмягі. Чуць жывы ад страху, дзяцюк з усяе сілы рвануўся ўзноў, аднак, і цяпер дарэмна: сярмяга была як прыкаваная да магілы.

У гэты момант сярдзіты вецяр з новай сілай завыў па полі, праляцеў па соснах і, ускалыхнуўшы званамі, што віселі на старой капліцы, жаласна заенчаў у яе разьбітых вокнах. Быццам, памагаючы гэтаму енку, званы неяк урачыста і таемна бомкнулі разоў некулькі, каб праз момант узноў сьціхнуць.

Перапужанаму Якубу здалося, што гэта абражаныя нябошчыкі пяюць і вызвоніваюць яму яго апошнюю гадзіну і ён ускрыкнуўшы немаголасам з апошніх сіл сваіх рвануўся ўперад. Аднак, дарэмна: магільная нявідзімая рука яго моцна трымала і ён, увесь пакрыты халодным прадсьмяротным потам, зваліўся пад крыж.

## V.

Успакоіўшыся троху ад перапуду, які нагнаў на прысутных Якуб, усе на розныя лады пачалі расказваць аб тым, што яны бачылі. Большасьць, аднак, была за тымі, якія цьвердзілі, што гэта быў адзін з абражаных Якубавай сьмеласьцю нябошчыкаў. Паміж імі вёў рэй стары Язэп. Тых, каторыя ўпэўнівалі, што гэта быў з крыжам Якуб, было нямнога.

— „Аднак, дзе-ж дзеўся Якуб?"

Кінуліся і сюды і туды, але яго нідзе не знаходзілі. Маладуха жалосна прымаўляючы бегала па хаце і прасіла ўсіх, каб ішлі шукаць яе даражэнькага брацікa. Паволі ёй удалося сабраць сьмялейшых хлапцоў, якія запаліўшы лятарні пайшлі на могілкі. Наперадзе ад усіх шпарка ішоў Бладысь.

Якуба яны найшлі хутка. Ён ляжаў расьцягнуўшыся на магілцы. Тут-жа быў і вінавайца, каторы так моцна трымаў Якуба. Гэта быў крыж. Полы даўгой сярмягі, у якую быў Якуб апрануты, папалі ў яму, а заціснуты ў яе крыж прыбіў іх да зямлі, як цьвікамі.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Праз два дні на могілках забялеўся яшчэ адзін новенькі крыж, пад ім ляжаў малады, адважны Якуб. І хоць перад сьмерцю сваей ён разбаіў усім аб тым, што і як з ім здарылася, — народ гэтаму не паверыў.

Вільня 18—20. I. 1925.

# ПСАЛЬМ.

Дасьпела душа мая ў цярпеньні, о Божа мой... Напоўнілі яе і Жаль і Боль, але-ж не апанавалі яе ні злосьць, ні ненавісьць. Апусьцела яна і ўвайшла ў глыб сваю, каб схаваць ад цікавага вока свой Сум і Жуду.

Пакрыліся раны яе тканінай містэрнаю, а пад ёй плыве і плыве кроў жывая...

Не затрымлівай, о Божа мой, Крыві плывучай, не адбірай яе агню жывога, бо акамянее душа мая, Пане, і цьвёрдай масаю зробіцца.

Няхай плыве кроў гарачая, няхай жыве Боль магутны, каб не сталася яна падобна да скалы горнай, нячулай на енкі і стогны ветру бяздольнага. **З. В.**

# Вясеньнія мотывы.

Плакалі вясеньнія ночы ў вадзе... плакалі, як-бы чароўным усьмехам неба, як-бы бледнымі зоркамі, як-бы ўміралі... Плакалі вясеньнія ночы... А ў гары чуўся сумны, жальбоўны крык буслаў, што вярнуліся на Бацькаўшчыну. Жальбоўны, бо як-бы жаль чагосьці было, бо было чагосьці жаль... А ночы плакалі ў вадзе, вясеньнія, ціхія, спакойныя... плакалі ў вадзе... А далі дыміліся лёгка-сінімі туманамі, якія вісьлі... і лашчылі вока... Плакалі ночы, як-бы гук скрыпкі, растропаны з усіх бакоў, п'яна, вібруючы нёсься туды ў нясказаную, неабмежную даль... дымлівую даль...

Плакалі, як дзіцё вясьны над разьбітым жыцьцём..., як плюскоты марскіх хваль... так тонка, так ласкава.. і заміралі... і п'яна расплываліся ў небі... А ў гары чуўся сумны, жальбоўны крык буслаў, што вярнуліся на Бацькаўшчыну... Вун, там на полі, яны зьбіраюцца, як студэнты пасьля жыцьцёвых раздарожжаў на пірушку... І нешта сумнае, сумна-мэлянхолічнае чуецца ў іх крыках... Запраўды сумнае, запраўды вясеньняе... А ночы.,. плакалі... Ночы, поўныя вясеньніх чараў, усьмехаў... ціха, як плескі мора, дрыжалі й заміралі; заміралі, п'яна, ціха, спакойна, заміралі... **Х. І.**

* * *

Дыхнула вясною!
І цёплы ветрык ўжо пралятае—
Бярозка галінкамі сумна махае
Над вузкай мяжою.

І ветрык вясновы угледзіў бярозку—
Узняўся і сьвіснуў к бярозцы падбег
Жывучы, як сьмех!

І лашчыцца, песьціць, абняўшы цалуе
І шэпча на вушка: вясна ўжо ідзе: –
Йдзе час вясельля, йдзе час каханьня—
Канец ўжо зімовай бядзе!

Пад цёплым дыханьнем ветра вясноваго
Ажылі галінкі—і кроплі з бярозкі
Паліліс, як сьлёзкі...

А ветрык, як каля дзяўчыны хлапец,
Ўсё круціцца, скача—
Бярозка ўсё плача...
Бо чуе яшчэ, што зімы не канец...

**Пятрук Музыкант.**

# ШЧАСЬЦЕ

**(вершаванае апавяданьне).**

Хтосьці па лесе ідзе і сьпявае,
Хустка між соснаў высокіх бялее,
Песьня зьвініць, як згубіўшы надзею,
Сонцу і небу ўкор пасылае..
Сонца ўсходзіць... Зьбялеўшыя зоры
Тануць у рожавым полымі — моры,
У чырвань малююцца соснаў вяршыны,
Рожавай робіцца імгла над лагчынай.
У лесе паўцёмна. Ліловыя змрокі
Ў чашчы хаваюцца соснаў высокіх.
Бор, прачыхаючысь, ціха шапоча
Сны — маячэньні канаючай ночы.
Хтосьці па лесе ідзе і сьпявае,
Небу і сонцу жальбу пасылае:

— „Хто ў нас з заранкай на поле выходзіць,
Сілы за працай цяжкай прараводзіць?
Эх, сіратінка так раніцай ходзіць,
Буйныя сьлёзкі на постаць раняе,
Горкую долю сваю праклінае.
Хто ў нас палуднем на ніўцы хінецца,
Дробнымі сьлёзкамі плача, ільнецца?
Эх, сірацінка так з працаю б'ецца,
Белаю ручкаю пот уцірае,
Сьпінку да чорнай зямлі нагінае,
Горкую долю сваю праклінае...
Цяжка на сьвеце, ой, цяжка, бяздольнай,
Хочацца волі шчасьлівай, раздольнай,

Хочацца ласкі, а людзі сьмяюцца,
Людзі чужыя ваўкамі здаюцца.

---

Матка Галіны ў рацэ ўтапілася,
Таткі ня ведала, нават, дзяўчынка.
Так і расла, як у лагчыне калінка,
Доля йнакшая Гальцы ня сьнілася.
Людзі ўзялі сірату, узгадавалі,
Людзі кармілі, а болей што... годзе...
Болей дасьць Бог, кажуць гэта ў народзе.
Дзеці дражнілі, пасьля ператалі.
Думнай дзяўчынай Галіна ўзрасла,
Год за гадом прыгажэй расьцьвітала
Цёмныя косы, ружовыя шчочкі,
Вочы--пралескі ці два васілёчкі,
Белыя, гладкія рукі і плечкі,
Голас бы плюскат крынічанькі, рэчкі.
Толькі маркотна жылося дзяўчыне,
Плакаць што ноч выпадала Галіне:
Воля, вядома, сірочая воля,
Мачахай злою была яе доля.
Моўчанькі Галя ўсе крыўды цярпела,
Жаліцца на'т у душы ня ўмела.
Толькі любіла ўночы сядзеці,
У цёмнае неба з тугою глядзеці.
Зоркі лілі ў душу маладую
Нейкую цішу і згоду сьвятую.
Год за гадом хвойкай вырасла Галя...
Вербнай нядзеляй сямнаццаць мінула.
Праца цяжкая яе не сагнула:
Стала вышэйшаю, — косы — як хваля...
Сьлёзы вачэй — васількоў не згасілі,
Шчочкаў ружовых ня зьмялі, ня змылі.
Крыўды надзеі ў людзёў не зламалі,
Злога ня ведала сэрцайка Галі.

---

Хтосьці па лесе ідзе і сьпявае,
Гэта Галінка чаромху ламае
У лесе, на краю зялёнай паляны
Сьветлай расой, як сьлязамі прыбранай.
Сонца з-за цёмнага бору ірвецца,
Скора і міла над зямлёй распаўзецца,
Цень між камлёў пасплятаны, вузорны,
Сіні, халодны, мясцамі йшчэ чорны,
Зьнікне ў золаце раньняга сонца,
У ласках вясеньніх, гарачых бяз конца.
Ходзіць дзяўчына, чаромху ламае,
З белых галінаў расу абтрасае,
Песьню маркотную ціха сьпявае.
Ходзіць і ходзіць... а дрэвы дарогу
Моўчкі ёй кажуць да чашчы ў разлогу,
Кажуць дарогу да тоні—балота
Тоні, дзе сонца блішчыць пазалота
У плямах, рудое, іржавай вадзіцы,
Тоні, дзе аер зялёны хіліцца,
Качкі ўюць гнёзды, і малых выводзяць,
Дзівы, дзе лес гулам жудасным родзіць.
Там над балотам, як чула Галіна,
Рэшткі згніваюць прастарага млына,

Мхом зарастаюць, а ў ім, між асокі,
Век дажывае млынар адзінокі.
Можа зайсьці варажыці? Ён мае
Сілу дзіўную і моц ня людзкую,
Чортаву, кажуць... вужакаў гадуе,
Лечыць, варожыць, урокі зьнімае...
Сэрцайка Галі калоціцца, б‘ецца
Так бы дамоў і пабегла, здаецца.
Ціха ідзе па мховай пасьцелі,
Твар пахаваўшы ў чаромхавай белі.
Холад іголкамі колец у грудзі.
Вось і балота... Хай будзе, што будзе.

———

Госьцю стары чараўнічы вітае,
З дзіўнай усьмешкай яе аглядае.
Белы, высокі, калматыя бровы,
Ссушаны твар, пажаўцеўшы, васковы,
Белая вопратка, пояс сатканы
З ніцяў грубых, кутасамі прыбраны.
Лапці з ліповага лыка, аборы...
Самае дзіўнае—вочы, як зоры,
Цёмныя, цёмныя—неба ўночы.
Усё пахаваюць, што знае, што хоча,
Добрае, злое, насьмешку ці ласку,
Долю праклятую, долю як казку,
Нейкі агонь у тым поглядзе дзіўным.
Голасам ціхім, глухім, заўныўным
Госьцю стары чараўнічы вітае,
Што яна, красная хоча, пытае.
Шэптам штось кажа старому Галіна,
Шчокі зьбялелі бы сьнег, палатніна,
Хоча аб долі сваёй запытацца,
З будучым часам таёмным спазнацца.
Мо‘ ужо любіць дзяўчынка кагосьці,
Мо‘ ужо заняў яе сэрцайка хтосьці?
Не, не аб тым, пэўна, кажа Галінка,
К дзеду схіліўшысь бы ў лесе калінка.
Любіць... ня любіць... а трудна прызнацца,
Сэрца даўно пачынае мо‘ рвацца,
Хочацца ўсё, усё выліць, сказаці —
Сорамна неяк, ну й трэба маўчаці.
Моўчкі стары чараўнік адыходзіць.
Кій свой бярэ, кола кіем абводзіць,
Коўшык прыносіць сьцюдзёнай вадзіцы,
Жменю ў ваду сыпле чорнай зямліцы,
Кажа дзяўчыне ў коўшык глядзеці,
Зёлкі прыносіць тым часам із клеці,
Крышыць іх, сыпле таксама ў вадзіцу,
У коўшык, куды і Галінка глядзіцца.
Ціха ў чорнай, закуранай хатцы.
Моўчкі стары пачынае хістацца
Штосьці нячутна і глуха шапоча,
Долю-нядолю пытае, прароча.
— „Устану я й выйду ў лес я паволі,
З лесу, бору выйду ў чыстае поле,
Стану я сьпіною там да заходу,
Стану чыстым тварам я да ўсходу...

Слухае Галя, чуць дыхае... душыць...
Звон, быццам, б'е аглушчаючы, у вушы.
Круціцца хата, туман ад парогу
Устаў... спавівае... ня помніць нічога...
Шэпча вядун і ў ваду заглядае,
Зёлак у коўшык сухіх падсыпае,
Сыпле; кажа ціха, паволі,
Жудасна, глуха, што далей, то балей.
— „Абвяжуся я хмарамі сівымі,
Падпаяшуся ранічнай зарою,
Паабтычуся зоркамі малымі,
Абмачуся чыстай расою,
Абсушуся сонейка касою...“
Шэпча ўжо толькі губамі аднымі
Тайну вялікую... водзіць вачыма.
„Ні зьмяніць тых слоў, ні даказаці нікому,
Ні чалавеку старому, ні малому.
Іх замкну я дзесяцьцю ключамі,
Зачыню іх дзевяцьцю замкамі,
А ключы па лесе параскідаю,
У ціне возера — балота пахаваю“...
Скончыў, прамовіў вялікія словы,
Словы апошнія ўжо, ключавыя.
„Будзеш шчасьліваю“, кажа Галінцы,
„Дзякуй кажы тэй шчасьлівай хвілінцы,
Як радзіла да жыцьця цябе маці,
Лепшае долі людзём не спазнаці“.
Кажа стары так, яе аглядае,
З дзіўнай усьмішкай у твар заглядае.

Дзіўна дзяўчыне... Крывёю гарачай
Уся залілася і ледзьве ня плача.
Хлеба ня мае, каб дзеду падаці,
Яек і сыру сіротцы дзе ўзяці?
Кветкі чаромхі яна сарамліва
Дзеду дае і бяжыць палахліва
Вузкаю сьцежкаю ў вёску ціхую
Зноў працаваць на сямейку чужую,
Сонца, што ўстала ў сьлед ёй сьмяецца,
Сэрца дзяўчыны калоціцца, б'ецца.
Верыць, ня верыць ёй сонейка ласкам.
Той варажбе, чараўнічым тым казкам?
Імгла распаўзлася, радзее і так
Сьветасьцяй раніца Галю вітае.
Звонкая песьня да сонца ільнецца,
Сэрца шчасьлівым прадчуцьцем ірвецца.

---

Доля і шчасьцейка, хто вас пазнае,
Тайну жыцьця на зямлі адгадае?
Шлеце надзеі і вабіце марай,
Нам абяцаеце шчасьце, а хмарай
Наша жыцьцё спавіваеце б'еце,
Сэрцу штодзень адпачыць не даеце...
Жыта на ніве яшчэ не дажалі, —
Галю ў гаёчку за вёскай хавалі.
Даўгае жыцьцё ёй доля давала...
Эх, на гадочак яго не дастала.
Стаяла ў тыдзень, бы ў царкаўцы сьвечка,
Хутка схудзелі і шчокі, і плечкі.

Вочы—пралескі зусім патускнелі,
Косы адны, як вясною, цямнелі.
Моўчкі дзяўчына цярпела, хварэла,
Моўчкі і паціху яна дагарэла.
Усё варажбу ў паўсьне ўспамінала,
Шчасьця й будучай долі чакала.
Лес успамінала, і сонца, й фіялкі
У даль усё глядзела паглядам русалкі.
Верыла Галя, што шчасьце ўжо блізка,
Так і сканала, як сонейка нізка,
Нізка стаяла і першыя зоры
Ужо запаляліся ў неба прасторы...

———

Доля і шчасьцейка, хто-ж вас пазнае,
Вашую тайну хто зглыбіць, хто знае?

**Натальля Арсеньева.**

# ГОЛАС НЁМНА.

(*Баляда з даўных часоў*).

„Гэй, ты, Нёман, рака, ты пацеш бедака,
Скажы скуль твае коцяцца воды,
Што зрадзіла цябе, як жылося табе,
Як прайшлі твае цёмные годы“.
Так на брэгу хлапец, Беларус—Маладзец,
Да сваей рэчкі моцна гавора;
Рукі крыжам зпажыў, галаву апусьціў,
Відаць, меў ён вялікае гора.
Так ён доўга стаяў, сваю песьню пяяў
І прасіў у Нёмана з сьлязамі
Каб сказаў ён яму, хоць такі аднаму,
Як даўно нас завуць Беларусамі.
Нёман ціха шумеў, быццам, жыцьця ня меў,
Думаў думку сваю векавую
І на гук малайца не сказаў ні слаўца,
А далей цягнуў песьню старую
Ахапіў хлапца жаль, зьвярнуў вочы ў даль,
Куды воды ён нёс чарадою,
Яму гукнуў, як звон, каб пачуў тое ён,
Беларус што загіне з душою.
Потым к рэчцэ бяжыць, каб канец палажыць
Свайей думцы, што ў Нёмна пытаўся:
Вочы моцна закрыў валасы разпусьціў
І ў вадзе з сьлязамі схаваўся.
Ускалыхнулась вада ад краёў аж да дна,
Прабудзіўся наш Нёман прастары

Падхапіў малайца, Беларусі хлапца,
І выняс яго ўверх ён на хвалі.

Доўга хвалі яго нясьлі аднаго,
Цалавалі кідалі як муху,
Пакуль жыцьцё яго ня прыйшло да яго,
Пакуль ён ня набраў сілы духа.

Потым ціха яго, улюбенца свайго,
Вынясьлі і на брэг палажылі,
Пацалунак яму, быццам, сыну свайму
На адходзе ласкава злажылі.

Хлапец доўга ляжаў і аб сьвеце ня знаў
І ня чуў, як бурліў Нёман глуха,
Пакуль гукі яго ня дайшлі да яго
І ня гукнулі: „хлапец, ты, паслухай“.

Тады хлопец наш сеў, ўжо сілу ён меў,
Каб паслухаць што Нёман гавора;
Каб пра тое ўсё што прасіў ён яго
Даведацца і забыцца пра гора.

„Ты паслухай мяне, раскажу я табе,
Як даўно я нясу свае воды,
Для каго тут прыйшоў, як сюды я зыйшоў
І якія тады былі годы“.

„Бо ты першы мяне пазыскаў для сябе
Сваім гукам, што гукнуў за мною,
Што быў чуцен на дне і прыемны ён мне:
„Беларусь што загіне з душою“.

„Гэта імя твае ёсьць сьвятым для мяне,
Беларусі ты сынам назваўся,
Усе сыны яе адыйшлі ад яе,
Толькі ты яе ня чужаўся“.

„Вось, за гэта мяне пазыскаў для сябе,
Ты за гэта ня заліўся вадою,
А цяпер табе ўсё раскажу пра жыцьцё
Й мой дух будзе заўжды с табою“.

„Была гэта даўно, калі жыцьцё плыло
Без бяды, кайданоў і палонаў,
Калі ўвесь наш сьвет быў лясамі адзет
І ня знаў ні сахі ні баронаў“.

„Тады чалавек, вольным шляхам хадзіў,
Быў падобны да птушкі-сокала,
Дзе хацеў, там пайшоў: ці ў лес, ці дамоў,
Усяго быў панам увокала“.

„Бо ня было тады ні паноў ні бяды,
Што-б змушала яго працаваці,

Дрэва домам было, жыцьцё мёдам плыло
І ня трэба было бедаваці".

„Калі ўжо ён старэў, калі ён дзяцей меў,
Толькі тады з бядой пазнаваўся,
Бо валокся ў сьвет, шукаць дзецям кабет,
Дзеля гэтага ён турбаваўся".

„Вось, адзін чалавек дажываючы век,
С пад Левантум валокся сюдою,
Меў траіх ён хлапцоў, усіх трох удальцоў,
Дзеля гэтых й пазнаўся з бядою".

„Прывалокся сюды праз чатыры гады,
Калі вясна йшла чарадою,
Калі ўвесь наш сьвет быў у лісьцьцё адзет,
А птушкі плылі грамадою".

„Калі наша зямля, як жытам чорна ральля
Цёплай восеньню — бывае — пакрываецца,
Калі яе жыцьцё тхне даброцяй усё,
Быццам, ангел які ўсьмяхаецца".

„Вось у такую пару ў гэтым нашым бару
Затрымаўся стары з малайцамі,
Каб сваю сілу ўзмацніць, надзею шчасьця ўзбудзіць
И ісьці далей з сваімі хлапцамі".

„І вось мамэнты вясны, як ідэальныя сны,
Надта ім спадабаліся,
Што апошнія годы свае тут яны
Рашылі дажыць у іх. І яны засталіся".

„Добра жылі яны між бароў тых адны,
Калі аб мэце яны забывалі;
Але сумна было, жыцьцё бурна плыло,
Калі аб жонках яны ўспаміналі".

„Ані пекнасьць вясны, ані ночныя сны
Бяды не маглі адагнаці,
Што мучыла яго, старога таго
І ён мусеў аб тым успамінаці".

„У дзень маркотны ён быў, уначы месяц прасіў,
Бы дзяцей яго супакоіў,
Каб дзяўчатак для іх, для няшчасных такіх,
Ён паслаў і пацешыў яго".

„Калі раз так стаяў калі просьбу складаў,
Голас які́сьці гукнуў вечавы.
Дубы затрасьліся, ветры ўзняліся
І паўстаў хто жывы, няжывы":

„Аб сынох не бядуй, сыну родны ты мой,
„Табе раніцай будзе ўсё.

„Тваім дзецям я сам жонак выберу, дам
„І пры іх шчасьліве скончыш жыцьцё.

„Зараз тут каля вас, як міне ночны час,
„Будзе бегчы рэчка бурлівая,
„На брэгу ля ей, каля маткі сваей
„Будуць сядзець дзяўчаткі думлівыя.

„То падругі хлапцоў, тваіх, бацька, сыноў,
„Краіне яны дадуць маладое жыцьцё,
„Рака тая для вас будзе маткай увесь час,
„Яна будзе даваць вам усё.

„Я сам вам ускажу, шлях жыцьця пакажу,
„Каб расьлі як дубы, ясакары
„І гэту сваю запаўнялі зямлю,
„Каб было іх як зоркаў у прасторы".

„Раптам сьціхла ўсё і старое жыцьцё
Паплыло сваею дарогай,
Толькі лес стаў шумець, вятры сталі гудзець,
Як-бы было аб'яўленьне Бога".

„Цэлую ночку яны між бароў тых адны
Трасьліся, усходу чакалі,
Каб хутчэй тое ім пабачыць самым
Аб чым гукі якіясьць гукалі„.

„Урэшці мілы наш дзень разагнаў цёмны цень
І па куточкам ўсюды развеяў,
Тады раптам усё ім аткрылась жыцьцё
І цэлая іхня надзея".

„Вось, што той чалавек, дажываючы век,
Мне гаварыў пра бытнасьць сваю,
А потым усяго быў я сьведкай таго,
Што рабілася ў вашым краю".

„У нізе перад імі я хвалямі сваімі
Жыў і несься чарадою,
Дрэвы каля мяне, што віталі мяне,
Таўпіліся цёмнай грамадою".

„Каля самай вады на каменьню тады,
Сядзелі ўбелі дзяўчыны,
На галоўках—вянкі з кветак як ваганькі
І з кветачкаў нашай маліны".

„Што за радасьць была, якое шчасьце было
Тых хлапцоў і бацькі старога,
Не падобна сказаць, ані то-ж апісаць,
Бо на гэта часу трэ' многа".

„Але вось што скажу, галоўны шлях пакажу,
Адкуль узялося імя Беларусі,

Бо Беларус пра жыцьцё, назоў, так-жа пра **ўсё**
Бацькаўшчыны сваей ведаць мусіць“.

„А што ў белі яны сядзелі тады,
То і дзяцей сваіх Белымі звалі,
Далей цэлы свой род, а потым й народ
Белай расы яны называлі“.

„С Белай расы тае выйшлі бацькі твае
Радзімічамі іх называлі,
А другіх Крывічы, трэціх Дрыгавічы
Як гісторыкі аб іх напісалі“.

„Але першы той род, скуль ідзе ваш народ,
**Быў род белых,**
Хаця людзі аб ім і ня знаюць,
Але знак людзёў тых перашоў у вас самых
І Беларусамі ўсе называюць“.

Раптам сьціхла ўсё і старое жыцьцё
Паплыло сваей чарадою,
Толькі хвалі яго гулі аднаго
І нясьліся ў даль грамадою.

**Б. Л.**

# Сон на Нёмане каля Шчары.

Далёка на захадзе сонца заходзе
І месяц глядзіць ужо з усходу,
Плыву я па Нёмне і з чоўна на сподзе
Узіраюся на ціхую воду.

Здаецца мне: сонца зноў бліснула і **стухнула**
І вечар наўкола пачаўся.
І бачу: як, быццам, сьвечкамі бухнула,
Далёка сьпеў сумны раздаўся.

Зусюль навакола званы зазьвінелі,
Аж лісьця дрэў затрасьліся,
А над ракою крукі закрычалі,
Высока ў верх падняліся.

Я бачу: плывуць вось плыты за плытамі —
І шмат на іх домікаў-будак,
І чую і бачу я: што між агнямі
Шмат плытніцкіх скрыпак і дудак.

На першых плытох там харугваў дуброва,
Штось ціха сабе шелясьціць,

А бліжай канца дамавінка цэдрова,
І ў ёй Беларусь там ляжыць.

А на абодвых берагах Нёмана
Сыны Беларусі ідуць
За імі радня іх—бяз плачу і гомана
І сьлёзы з вачэй ня плывуць.

Усе ціханька хваляць Нябошчыцы сілу
І славу, што мела даўно —
Цяпер праваджаюць Яе ў магілу:
У Балтыйскае мора на дно...

Званы ўжо апошні раз Ёй загудзелі,
Апошні паклон дасца Ёй,
Глыбока паложаць на морскай пасьцелі
І будзе Ёй вечны спакой...

Нідзе ня чутно ані плачу, ні енку —
Халодныя сэрцы, як лёд.
Дзе-недзе ўздыхаюць дзяды памаленьку,
Ды дзівіцца іншы народ.

Аж збегліcь на бераг зусюль каля Нёмна
Дзяцей беларускіх гурткі,
І з берагоў, крыху дзе рака заломана,
Ёй кідаюць з кветак вянкі.

І міла так слухаць іх голас дзіцячы,
Што роднай душой аддае:
„Хай Матухна ўстане, нас крышку пабачыць,
„Мы ўсе тут жывем для Яе!“

„Мы ўмеем маліцца пабеларуску,
„Пяяць, і пісаць, і чытаць, —
„У вопратцы роднай, у школе ўжо нашай
„Народныя танцы скакаць“.

„Дык выйдзі-ж, Матухна, ўстань, падзівіся,
„Мы хочам пабачыць Цябе,
„Паблагаславі нас, пацеш, памаліся —
„Ды потым паедзеш сабе! —
. . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Тымчасам мой човен аб камень удэрыў,
Аж скалыхнуўся ды стаў
Вачам сваім доўга з прасоньня ня верыў,
Што плыў я на чоўні і... спаў.

Дык гэта быў сон толькі?.. Мілы мой Божа!“
Я, вочы працёршы, пытаў. —
Вось сон часам многа паказываць можа:
Калі што, як прыдзе на яў.

1922 г. I/VII. Слонім. **Гальяш Леўчык.**

# Студэнт на чужыне.

Няма на сьвеце прыгажэй
Пары вясны, пары студэнства:
Наш небасхіл гарыць ясней,
І моладзь траціць падабенства
Людзей рэальных... Быццам, з мар
Жыцьцё складаецца выключна...
Няма клапот, ні чорных хмар...
Жывуць зямля і неба злучна.

---

Было так дзесяць год назад,
Цяпер зрабілась штось другое,
Студэнт жыцьцю свайму ня рад
І гора мучыць яго злое.
Няма надзеі, пекных мар,
Што будзе заўтра, ён ня знае...
І, быццам, месяц із-за хмар
Бяда і голад выглядае.
Куды падзецца, уцячы...
Кругом варожыя, чужыя...
Сваіх за ворагаў лічы,
Бо сталі тут усе такія.

Агіда, помста і разлад
Пануе ўсюды між сваімі...
Атрутай стаўся брату—брат...
Паміж зьвярмі жывём ліхімі.
Няма сямьі, прапала матка...
Забіты бацька дзесьці там...
Стаіць сіроткай у полі хатка
У чужыне сьмерць прыйшла братам
І ён у чужыне апыніўся,
Ды шчасьця ўжо і тут няма,
Бо ў Беларусі ён радзіўся,
А без яе ўвесь сьвет турма.
Ня цешыць веда і культура,
Калі душа агнём гарыць...
Усе падобна авантуры,
Калі на Бацькаўшчыне сьпіць,
Як на магільніку ўсё тое,
Што можа душу разбудзіць...
Хай згіне там усё чужое!
Для сваяго хачу я жыць.

**Сумны.**

# Славянам.

Убогі, абняты паганаю доляй—
Багатыя духам, браты!
Каму непраглядная цемра няволі
Навеяла сон залаты!
Чаму нам ня глянуць сабе навакола
І раніцы пахам дыхнуць?
Узыйшоўшаму яснаму сонцу вясёла
Славянскі свой гімн зацягнуць?
Чаму нам ня кінуць узаемнай нязгоды,

Славяне? Брат брата абняць?
Каб людзкае права народнай свабоды
Агульнай сямьёй скарыстаць?!
Здабудзем-жа веру ў нязломану сілу,
Паставім, паднімем свой стан—
. . . . . . . . . .
І будзе нам маткаю роднаю, мілай
Вяліка дзяржава славян!

**Ф. Ч.**

# Народныя песьні.

—„Ой, чырвона каліна
Да ўсю весну красіла,
Маладая да дзяўчыненька
Свае сэрца сушыла.

А я тую каліну
Паламлю, ды пакіну,
За ліхім мужам, за разбойнічкам
Я навекі загіну.

Ой, пайду я да броду,
Ды да броду па воду,
Ой, да стану я, да падумаю
Ці харошага роду.

Я харошага роду
І на твар я „прэкрасна“
Аддала мяне ды матуленька,
Дзе дружына няшчасна!
Ой, пайду я да рэчкі,
Да ў той рэчцы ўтаплюся,
За ліхім мужам, за разбойнічкам
Я ў-ва век не разжывуся!“

—„Не тапіся, дзіця, ты,
Бо на век душу згубіш,
Трэба было мне, ды упярод казаць
Каго верне ты любіш“.

—„Каго верне любіла
Таго ў век ня забуду
Наракала я на матуленьку
Й наракаці я буду“.

Са слоў **Любы М.**

Веска Кубяльнікі з-пад Горадні.

* * *

Ляці, коню, дарогаю,
А якою—шырокаю,
Ляці, коню, пад вароты,
Стукні, грукні падкоўкамі;
Каб падкоўкі забрашчалі,
Каб вароты затрашчалі.
Да це выйдзе стара бабка,
Стара бабка—родна матка.
Будзе цябе гаўсом вітаць,
Будзе ў цябе праўды пытаць.
Ня каж, коню, што ўбіт ляжу,
А кажы, коню, у войску служу
У войску служу, ажаніўся,
Усей радзіме пакланіўся,
А ўзяў жонку валынушку,
У чыстым полі магілушку.
Вазьмі, маці, пяску жменю,
Пасей яго на каменю,
Калі гэты пясок зыдзе,
Тады сын твой з вайны прыдзе.

Са слоў **Любы М.**

Веска Кубяльнікі з-пад Горадні.

* * *

Каліна й маліна
З ветрам гаварыла
Парадзіла міне маці
Жаўнерскага сына.
Парадзіла міне
Сярод цёмнай ночы,
Да дала бела ліцэ
І чорныя вочы.
Ня было-б, мая маці,
Чорных вачэй даваці
Да было-б, мая маці,
Шчасьце й долю даці,
Бо ўжо міне наставілі
У салдаты аддаці.
Сеў жаўнерак есьці
Прыйшлі з палка весьці
Кідай вячэраці
Час на каня сесьці.
Жаўнерак сядае,
З раднёю прашчае

Жонка маладая
Зямлю прабівае.

---

Ні дай, Божа,
У чужой старане ўмерці,
Німа каму дагледзіці
Жаўнерскае сьмерці.
Арол прылятае
І сьмерці чакае
Цела адаўбае
А косьці пакідае.

Спісаў **Ю. Кастэцкі**
в. Гаркавічы з-пад Саколкі,
Горадзяншчына.

# Беларускі Сакол, яго мэты і арганізацыя.

(Гл. № 1 „Студ. Дум.").

Цяпер затрымаемся над пытаньнем, як мы прадстаўляем сабе арганізацыю Беларускага Сакала?

Па першае: хто можа быць сябром Беларускага Сакала? Сябром можа быць: мужчына або жанчына, найменей 18-ці гадовы, славянскае народнасьці, без завады; той, хто прысягаў, што будзе выконываць усё тое, што яму накажа арганізацыя. Прыймаецца усякі той, хто ня мае завады нятолькі ў сэнсе закону, але і ў сэнсе маральнасьці сакольскае. Яму выстаўляюцца запатрабаваньні: пастарацца аб сакольскім усьведамленьні, падрабіцца сакольскім мэтодам выхаваўчым, жыць пасакольску ў пастаяннай службе народу, братэрству і поступу.

Разрозьніваем сяброў поўнапраўных і прынятых на іспыт. У-ва ўсіх другіх прыпадках усе роўныя ў правох і павіннасьцях. У Сакале няма сяброў чынных, спачуваючых і г. д., гэта ёсьць новае г. з. адзіночнае сяброўства.

Час іспыту трывае звычайна 6 месяцаў, але, аднак, можа быць прадоўжаны ажно на год. Прычыны прадаўжэньня: уласная просьба сябры прадоўжыць час іспыту, або жаданьне прэзыдыуму здружэньня ляпей пазнаць пэўнага сябру, або ўрэшці невыпаўненьне прадпісаных павіннасьцяў. Гэтыя павіннасьці:

a) праслухаць ідэёвую школу сакольскую; ад гэтага можа быць звольняны той, хто зложыць іспыт за такую школу;

b) выпаўненьне ўсіх сяброўскіх павіннасьцяў, асабліва павіннасьцяў муштровых.

Ад выпаўненьня павіннасьцяў муштровых можа быць звольняны толькі з прычыны хваробы ці заняткаў і то *maximum* на год.

Час іспыту канчаецца:

a) калі прэзыдыум абвесьціць сябры, што да прысягі яго ня можа дапусьціць. Можа гэта стацца тады калі прэзыдыум даведваецца аб пэўным сябры нешта кампрамітуючае яго нагэтулькі, што ён не дапусьцімы ў Сакол. Гэтым канчаецца ягонае сяброўства.

b) калі сябра ўсё, што патрабуецца ад яго ў час іспыту выканаў, быў пазваны да сакольскае прысягі і выканаў яе ў пастаноўляным тэрміне.

Злажыўшы прысягу сябра атрымоўвае ўсе сакольскія правы г. ё. права ўчасьнічаць у-ва ўсіх муштрах і прадпрыемствах, якія робіць здружэньне, права карыстаць з усіх іншых сакольскіх выгад; права галасаваньня на ўсіх агульных сходах; права выбіраць і быць выбранаму; права насіць сакольскую вопратку і сакольскі грудны адзнак „На варту".

Братом здружэньня перастае быць:

1. Той, хто падае пісьменную заяву аб выступленьні.

2. Той, хто ня плаціць сяброўскіх складак балей як тры месяцы, нягледзячы на прыпаміnаньні з боку прэзыдыума.

3. Калі невыпаўняе сакольскіх павіннасьцяў нат' пасьля трох напамінаньняў.

4. Калі здружэньне пэўнага сябру за грубае нарушэньне чэсьці або сакольскае дысцыпліны выключае.

Сябры аб'еднаныя твораць Здружэньне.

a) найгалаўнейшай праўнай адзінкай здружэньня ёсьць агульны сход, які можа вырашаць абсалютна ўсе пытаньні.

b) Агульны сход выдзяляе з сябе 5 братоў, атрымаўшых абсалюторый даверра, якія твораць Прэзыдыум Здружэньня.

c) Агульны-жа сход выдзяляе з сябе 3 братоў т. з. рэвізыйную камісію, якая кантралюе працу прэзыдыума.

d) На прыпадак калі б вышлі непаразуменьні паміж братамі Агульны сход выбірае Суд Гонаровы з 3 братоў.

Калі Здружэньне разрастаецца пры ім можа быць утворана пабочка, якая, аднак, сама нічога ня можа рашаць і падпарадкоўваецца суцэльна Здружэньню.

Аб'яднаньне Здружэньняў творыць сакольскі павет. Паветы твораць сакольскую губэрню. Губэрні — край і нарэшці ўсё беларускае сакольства творыць Агульны Беларускі Сакол.

Арганізацыя ў-ва ўсіх паіменаваных аддзелах падобная, як і ў Здружэньні. Толькі агульныя сходы там ужо зьбіраюцца не з усяго сяброўства, а з яго прадстаўнікоў і, зразумела, што чым вышэйшы аддзел, тым шырэйшую працу ён выконвае.

Ад часу да часу, дзеля перагляду сілаў, склікаецца агульнасакольскія зьлёты.

Чым-жа павінен кіравацца сябра Сакала?

1) Тымі ідэямі, якія палажаны ў аснову Сакольскае Арганізацыі.

2) Пастановамі Здружэньня губэрні і Агульнага Беларускага Сакала; паскольку-ж мы такіх пастаноў яшчэ ня маем—пастановамі і разалюцыямі агульных З'ездаў Чэскага Сакала.

Сакол—арганізацыя абсалютна апалітычная, але нацыянальная.

Сябры Сакала называюць адзін аднаго „брат" і заўсёды звароч-

ваюцца на „ты“. Сябра і сяброўка зварочваюцца на „вы“; сябра называе сяброўку сястрою. Значаньне гэтага: роўнасьць—братэрства.

Сакольская вопратка можа ўжывацца, толькі ў прыпадках, калі на гэта ёсьць дазвол Прэзыдыуму.

Павіннасьць, выплываючая з арганізацыі, жадае безварункова дысцыпліны, аднак, не бязсэнсоўнае.

Кажды брат мусіць зрабіць зараз-жа ўвагу другому брату, калі той другі робіць нешта дрэннае, бо „Братэрства“ ня ёсьць у тым, каб ня відзець фэлераў брата, але, каб іх выткнуць, толькі ў спосаб братэрскі,—кажа Тырш.

Рацыянальнае, братэрскае дысцыпліны арганізацыя дамагаецца нават і спосабамі караньня, як то: выгаварам перад прэзыдыумам, ці шэрэнгаю, пазбаўленьнем сакольскіх правоў і ўрэшці вылучэньнем з Сакала.

У поўным і адданым выпаўненьні арганізацыйных павіннасьцяў—сіла Сакольства, з яго выплываюць вялікія ўсьпехі Сакольства.

Нашыя вялікія акцыі ў службе народу, Славянству, братэрству.

Дык браты і сёстры! За сьветлыя ідэі сакольства, за Нашу Дарагую Бацькаўшчыну, усе як адзін уперад!

Усе за аднаго, і адзін за ўсіх!

Там сьвет гнецца, куды сіла напрэцца! **Вячаслаў Лаўскі.**

---

# Успаміны аб „Горадзенскім Гуртку Беларускай Моладзі“.

Вось яшчэ адныя ўгодкі аб каторых, аднак, мала хто, або ляпей, амаль ніхто ня ведае.

19-га лютага 1910 года была наладжана ў Горадні першая беларуская вечарына-спэктакль. Захаваўшаяся, ніжэй прыложаная праграма паказывае паважныя мэты, якімі кіраваліся арганізатары вечарыны.

I. 1) Прамова—А. Бычкоўскі. 2) „Беларусы і іх нацыянальнае адраджэньне“ рэфэрат— П. Алексюк. 3) „А хто там ідзе?“ муз. Рогоўскаго — Ю. Косацка і З. Абрамовіч. 4) „Пажалей мужыка“ верш Я. Купалы — А. Клюкоўскі. 5) Музыка. II. „Па рэвізыі“, кам. ў 1 д. Крапіўніцкага. III. 1) „Дудка“ верш Мацея Бурачка — Э. Кунда. 2) „Гора“ муз. N. N. Ю. Косацка 3) „Ямшчык“ верш Я. Лучыны П. Алексюк і К. Бужыньскі. 4) „Храк“ манал. — А. Ляўковіч.

Вечарынка была наладжана ў прыватным памешканьні (ў доме Салянкаў на Паліцыйнай вуліцы), дзеля чаго і сцэна і саля былі

страшэнна цесныя. Ня гледзячы на гэта артысты іулялі добра, а гасьцей сабралася гэтулькі, колькі здолела памясьціцца; былі паміж імі і Беларусы ўжо сьвядомыя і прыхільнікі; паміж апошнімі нельга ня ўспомніць цяперашняга пасла Сыльвэстра Ваявудзкага, у той час вучня горадзенскай гімназіі. На жаданьне публікі на другі дзень спэктакль цалком быў паўтораны.

---

Артыстамі і загадчыкамі спэктаклю былі выключна сябры незадоўга перад тым, увосені 1909 г. зарганізаваўшагася: „Горадзенскага Гуртка Беларускай Моладзі". — Г. Г. Б. М., як называў сябе гурток дзеля канспірацыі, бо зложаны з адных гімназістаў і гімназістак быў — нялегальным.

Закладчыкамі і кіраўнікамі гуртка ў першым пачатку былі кс. Д. Грынкевіч і вучань 7-ай кл. гімназіі Адам Бычкоўскі (першастрэчны брат тагочаснага рэдактара „Беларуса" Антона Бычкоўскага).

На арганізацыйным паседжаньні быў выбраны ўрад гуртка, каторы складаўся з старшыні А. Бычкоўскага, віцэ-старшыні П. Алексюка, сэкрэтара З. Абрамовіча і бібліятэкаркі Л. Сівіцкай.

Працу сваю гурток пачаў пэрыядычнымі (раз у тыдзень) „лекцыямі" на каторых чыталіся і разбіраліся творы беларускіх пісьменьнікаў, праходзілася гісторыя і геаграфія Беларусі.

— У хуткім часе бібліятэка гуртка пачала павялічвацца й апроч „Нашай Нівы", „Смыка", „Дудкі" ды „Жалейкі", якія былі ахвярава-

Горадзенскі Гурток Беларускае Моладзі ў 1910 г.

ны гуртку пры яго „нарадзінах", мела ўсе кніжкі, якія толькі можна было дастаць у Вільні і ў Петраградзе. — Кніжкі і календары, а таксама „Наша Ніва" выпісываліся „на камісію і разходзіліся ня толькі па Горадні але і па вёсках, бо кожны сябра гуртка абавязаны быў прадаваць кніжкі ў як найбольшым ліку. — Грошы прыдбаныя такім спосабам ішлі цізноў на патрэбы бібліятэкі і канцыляры гуртка.

— Першым, так сказаць, публічным выступленьнем гуртка была вышэй успомненая вечарына. Але-ж гэтым агранічыцца нельга было.

Г. Г. Б. М. маніўся пашырыць сваю працу на вёску і дзеля гэтага падчас тых-жа запускоў цэлы склад артыстаў паехаў на вёску, дзе йзноў ставілі „Па рэвізыі", дэклямацыі і быў прачытаны асьведамляючы рэфэрат. Гэтая першая вечарына для „вёскі" была наладжана ў Сакольшчыне, у маёнтку „Крыштапарово", каля мястэчка Новый-Двор.

— Вялізарная саля, паміма дрэннай пагоды была поўная людзей з вёсак Міленкоўцы, Пагаране і Берніkі.

Пасьля запускоў гурток ізноў вярнуўся да нармальнага жыцьця г. з. да лекцыяў і паседжаньняў, каторыя ў хуткім часе, з наступаючай вясной замяніліся „спацырамі" за места, найчасьцей над Нёман, у Ласосну, дзе пад шум вады і сьпевы птушак пачаў прабаваць свае сілы—гуртковы хор.

Карыстаўся хор 1-м Сьпеўнікам А. Грыневіча, але найчасьцей пяялі песьні прывезеныя з сваіх родных вёсак і такім чынам вырабіўся зусім арыгінальны, свой уласны рэпэртуар. Загадчыкам хору быў сябра Янка Ляўковіч, называны ў гуртку „Капэльдудкай". Канец школьнага году перарваў працу гуртка, сябры катораго раз'ехаліся па вёсках і хвальварках забіраючы з сабой беларускія кніжкі, а, што яшчэ важнейшае, нацыянальную сьвядомасьць.

—У пачатку новага школьнага году: 1910—11 лік сябраў гуртка значна павялічыўся.

Горадзенскі Гурток Беларускае Моладзі ў 1911 г.

Прыбыло шмат хлапцоў з малодшых клясаў дзеля чаго прышлося падзяліць гурток на 3 сэкцыі: старшую, сярэднюю і малодшую. Старшая і сярэдняя займаліся літэратурай гісторыяй і географіяй Беларусі, і кіравалі малодшай сэкцыяй, сябры каторай, вучні I і II кл. гімназіі, чыталі пабеларуску, пісалі дыктоўкі, вучылі вершы і г. д.;

раз у месяц рабіліся для іх вечарынкі з дэклямацыямі, сьпевамі і гульнямі.

Амаль ня з самай восені старшыя сябры Г. Г. Б. М. пачалі падгатаўляцца да вечарыны. — Пасьля Каляд гэтая падгатаваўчая праца яшчэ больш ажывілася, бо трэба было думаць аб дэкарацыях, праграмах і г. д. — За складкавыя грошы пашылі куртыну з намаляваным усходзячым сонцам, малявалі „вокны“, усялякіе аздобы, прывязьлі з вёскі Беляне Сакольскага пав. цэлыя мяхі арыгінальных старасьвецкіх вопратак і нат'—вясковага музыку-скрыпача.

Наканец, каля палавіны лютага 1911 г. адбылася вечарына, тым больш памятная, што ўшанаваў яе сваей прысутнасьцю с. п. Іван Луцкевіч, сумысьля прыехаўшы з Вільні.

— Быў насамперад прачытаны рэфэрат на тэму: „Адгалосак душы беларускага народу ў яго песьнях, казках і легэндах“.

Далей пяяў хор і была пастаўляна камэдыйка Каганца „Модны Шляхцюк“. — Як яна сыйшла няхай сьведчаць словы І. Луцкевіча: (з карэспандэнцыі памешчанай у „Нашай Ніве“, № 8, 1911 г.). — „Я дзівеваўся, гледзячы на артыстаў, як яны ўмелі падглядзець, падсьцерагчы характар вясковых сватаньняў, умелі ўстроіць усё так, як яно папраўдзе бывае ў хаце беларускай“.—У канцы карэспандэнцыі кажа: „Вынес я ў падзяку за прыемны вечар, веру, што горадзенская беларуская моладзь родную справу пасуне ўперад“.

Так, была надзея...

У вечары гэтым прыймалі ўчасьце: Л. Сівіцкая (Ганка), І Левіцкі (бацька), К. Колышко (шляхцюк), В. Семяновіч (Ігнась), Я. Леўковіч (сват). А. Зянюк—суфлёр, А. Бычкоўскі—рэжысэр.—Дэклямавалі і належалі да хору: А. і М. Салянкоўны, Ю. Грынкевічанка, С. Кундоўна, Касацкая, М. Бобрыкоўна, Ф. Лабенец, А, Сьпевак, Э. Кунда і другія.

У пару тыдняў пасьля ўвесь склад артыстаў, хор і аркестр струнных інструмэнтаў, паехалі ў Сакольшчыну, дзе ў маёнтку Дубніца быў паўтораны вышэй апісаны спэктакль.

— Гарачыя, маладыя арганізатары спэктаклю, маючы адно вялікае жаданьне: ісьці „ў народ“, не раздумывалі да якіх вынікаў можа іх давясьці гэтая паездка. Справа ў тым, што дазволу ад паліцыі на вечарыну ня было, а да гэтаго адбылася яна ў маёнтку горадзенскага архіярэя, аб чым арандатар і жыўшы ў маёнтку манах не абмінулі ў хуткім часе архіярэя паведаміць. Справа адразу апынілася ў губэрнатара і толькі дзякуючы знаёмству з адным чыноўнікам губэрнатарскай канцыляріі, удалося яе схаваць „пад сукно“.

Самую-ж вечарыну жыхары вёсак: Беляне, Хварасьцяне і Стрэльчыкі ўспамінаюць па сёньняшні дзень.

У тым-жа самым школьным годзе ў траўні (май) месяцы адбылася маёўка, на каторай Г. Г. Б. М. разьвітаўся з вялікім жалям з сваім арганізатарам і першым старшынёю Адамам Бычкоўскім, каторы скончыўшы гімназію выяжджаў з Горадні.

— Нядоўга паждаўшы ўсе сябры гуртка раз'ехаліся на летні адпачынак.

Л. С—Ш.

(Працяг будзе).

# ХРОНІКА.

— **Па загаду п. Камісара Ураду на м. Вільню сканфіскаваны № 2 (3) „Студэнская Думка“.**

— Каб даць большую магчымасьць сябром Б. С. С. карыстаньня бібліятэкаю, у летнім трымэстры, бібліятэка Бел. Студ. С. будзе адчынена што-суботы ў гадз. 6 — 8 увечары.

— Урад Бел. Студ. Саюзу пастанавіў арганізаваць рад рэфэратаў. 1. III. ў салі Беларускай Гімназіі быў прачытаны п. А. Луцкевічам рэф. на тэму „Экономічная эволюцыя і беларускі адраджэнскі рух“. 15. III. там-жа п. Р. Астроўскім — рефэрат на тэму „Космогонічныя гіпотэзы“.

У летнім трымэстры адбудзецца дальшы цяг рэфэратаў, паміж імі будуць і з дыскусіямі. 26. IV. п. праф. Бр. Тарашкевіч мае прачытаць рэфэрат на тэму „Мова і Народ“.

— Меўшаяся адбыцца 21. III. вечарына. ладж. Бел. Студ. Саюзам, з прагр. „Шчасьлівы муж“ Фр. Аляхновіча і канцэртны аддзел— не адбылася, бо п. Камісар Ураду ня даў дазволу, быццам, таму, што ў праграме быў беларускі гімн: „Ад веку мы спалі“... Калі ня будзе перашкодаў з дазволам, тая-ж вечарына адбудзецца 2 траўня. Пачатак у 7½ ўвечары.

— Сёлета 25 сакавіка Беларусы сьвяткавалі 400-ыя ўгодкі заклядзінаў першае друкарні ў Вільні беларускім гуманістам Францішкам Скарынай.

У дзень сьвяткаваньня адбылася акадэмія ў 8 гадз. вечара ў салі Беларус. Гімназіі.

— У зьвязку з угодкамі Бел. Нав. Т-ва выдала кніжку, нап. Ад. Станкевічам, „Доктар Францішак Скарына — першы друкар беларускі“.

— На межах 1924—25 г. мінулі 40-я ўгодкі сьмерці аднаго з найстарэйшых беларускіх літэратараў, бацькі беларускага тэатру, Вінцука Дунін-Марцінкевіча.

— **Ад рэдакцыі.** Дзякуючы нястачы грошай гэты нумар абслугоўвае 2 месяцы.

## ПАТРЭБНАЯ КНІЖКА.

Аўтарка „Батанічнага Слоўніка“ Зоська Верас апрацавала кніжку пад назовам „Мядовыя расьліны“. У кніжцы, вялікшай за „Батанічны Слоўнік“, ёсьць беларуска-польска-маскоўска-украінска-лацінскі слоўнік вылучна мядовых расьлінаў. Далей ідуць дэталічныя апісаньні кожнае расьліны: выгляд яе, дзе расьце, як множыцца, яе карысьць і г. д.

У канцы ёсьць аддзелы расьлінаў „прамыслова-мядовыя“, „садова-мядовыя“ і г. д.

Аўтарка, якая з вялікай любасьцяй пасьвячаецца сваей працы, зьяўляецца ў нас рэдкім чалавекам, які з беларуска-навуковымі мэтамі займаецца батанікаю.

Пажадайма, каб барджэй знайшліся выдаўцы на гэтаю важнаю кніжку.

Рэдактар-Выдавец: **Адольф Зянюк.**